Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

ПРЫВІТАННЕ З 1928 ГОДА

Гэтая невялікая паштоўка спачатку была для мяне проста фотаздымкам, які я не раз бачыў у эмігрантазнаўчых публікацыях Лявона Юрэвіча. На прыступках нейкага будынка (як мне здаецца, сёння гэта Рускі тэатр імя Горкага) стаялі беларускія літаратары: Алесь Дудар, Васіль Каваль, Аркадзь Мардвілка, Ізраіль Плаўнік, Наталля Вішнеўская, Мікола Нікановіч, Зінаіда Бандарына, Ілары Барашка. Многіх з іх праз якія 5—10 гадоў чакае блуканне па пакутах: лагер, высылка, следства, расстрэл. Некаторыя ацалеюць.


Якім жа было маё здзіўленне, калі я ўбачыў арыгінал гэтага здымка, які захаваўся ў зборах Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку. На адвароце яго быў ліст да аднаго з прыкметнейшых пісьменнікаў 1920-х гадоў Алеся Дудара, напісаны на ўкраінскай мове. Урэшце ўвесь тэкст атрымалася прачытаць. Вось ён.

Б.С.С.Р.
Менск.
Правадная, 15а кв. 2
Ал. Дудару

1928. 19/XI

Дорогий Алесь!

Кожного дня збіраюся тобі надіслати листа і кожного дня не встигаю. Зараз примусив себе хоч листівку послати. Не гнівайся на мою мовчанку і адгукнуся. До речі,



пороблю ще фото, то пришлю. Готуемо з Поліщуком книжку «Білорусь крокуе» про нашу подоріж. Як жівете? Привіт Сташевському, Баращі, Чароту, Вишневській і всім. І досі найкращі спомини — це спомини про Білорусь.

Твій Андрій.

Передай вибачення т. Вишневській, що так її покалічено в «Молодняку» на фото. Я в тому не винен.

Харків, ул. Лібкнехта 31, «Плуг».
А. С. Панів



Андрый Сцяпанавіч Паніў.

Аўтар ліста, Андрый Сцяпанавіч Паніў (ці, больш звычна па-нашаму, Паноў) (1899—1937) — адзін з прадстаўнікоў украінскага «расстралянага адраджэння», паэт, перакладчык, арганізатар літаратурнага працэсу ў Харкаве. У прыватнасці, быў нязменным адказным сакратаром літаратурнага аб'яднання «Плуг».

Біяграфія яго амаль тыповая для пакалення: нарадзіўся ў небагатай сям'і пісара. Скончыў настаўніцкую семінарыю, пасля рэвалюцыі — інстытут народнай адукацыі (1921—1925). Потым — літаратура і журналістыка: праца ў газетах «Селянська правда», «Вісті ВУЦВК», «Культура і побут», «Комуніст», часопісах «Плуг», «Плужанин», «Шляхи мистецтва», «Комунарка України», «Сільськогосподарський пролетар», «Сількор України», «Всесвіт». Асобнымі кніжачкамі пабачылі свет зборнікі вершаў «Вечірні тіні» (1927), «Без межі» (1933), кніга для дзяцей «Як звірі хату будували» (1925), зборнікі навелаў «Село» (1925), «Христя» (1928), а таксама некалькі падручнікаў для малодшых школьнікаў.

Украінска-беларускае пабрацімства 1920-х гадоў яшчэ не да канца вывучана. Больш вядома пра кантакты з Украінай Янкі Купалы і Якуба Коласа. Так, у фотакаталогу Купалы «Ты гэтых вачэй не забудзь...» (2012) можна ўбачыць фота беларускіх пісьменнікаў у Харкаве 3 сакавіка 1928 года. Побач з Купалам, Коласам, Гартным, Чаротам, Зарэцкім — і сябры Андрыя Панова — Валяр'ян Палішчук, Сяргей Піліпенка, Пётра Панч, Паўло Тычына. Безумоўна, і ён сам пазнаёміўся з літаратарамі з Беларусі. Пацвярджае гэта іншы здымак з каталогу, датаваны ўжо 19 мая 1928 года. На падворку дома Янкі Купалы ў Мінску — група ўкраінскіх гасцей з беларускімі сябрамі. Першы злева ў другім шэрагу — Андрэй Паноў. Вельмі можа быць, што пра гэтую паездку ён і згадвае ў паштоўцы да Алеся Дудара. А здымак на прыступках зроблены тады ж — вясной 1928 года.

Арыштавалі Панова ў 1934-м, пасля нядаўняга забойства Кірава, калі рухавік рэпрэсій, знайшоўшы сабе апраўданне, разгарнуўся з шалёнай сілай. 10 гадоў СЛОНу — «Соловецкий лагерь особого назначения», а праз колькі часу — за арганізацыю (у лагеры?) партыі «Всеукраїнський центральний блок», шпіянаж і падрыхтоўку тэрактаў — расстрэл у 1937-м.

Дудара арыштуюць значна раней — за верш «Пасеклі наш край папалам» у сакавіку 1929-га, праз тры месяцы пасля гэтай паштоўкі. Потым высылка ў Смаленск, нібыта дараванне, і праца ў 1930-я гады ў пісьменніцкай грамадзе. Але ў 1936-м ізноў дастануць ягоную справу і асудзяць, расстраляюць за некалькі дзён да Андрэя Панова — у страшную ноч на 30 кастрычніка 1937 года, калі былі забіты больш за 100 культурных дзеячаў Беларусі.

Але на паштоўцы — па-ранейшаму маладыя твары, і украінскі сябра прабачаецца за няякасны друк фота ва ўкраінскім часопісе «Молодняк» — аналагу беларускага «Маладняка», як быццам гэта сама вялікае гора, што можа быць для маладога літаратара.